5. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. – Витебск: Губ. типо-лит., 1903. – VIII, 32, 256, 119, 19 с.
6. Горбачевский, И.Д. Лепельский уезд Витебской губернии / И.Д. Горбачевский. – Витебск: Губ. тип., 1895. – 38 с.
7. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск: Губ. тип., 1914. – [2], VI, 280, LXX, 42 с.
8. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. С.-Петербургской тюрьмы. – [Вып.] 22: Минская губерния. – 1904. – [4], XVI, 243 с.
9. Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. – Минск: Тип. губ. правл., 1859. – 155, 112 с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1873 год. – Минск: Губ. тип., 1872. – 293 с.
11. Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. – Минск: Губ. тип., 1914. – 232, 185, III с.
12. Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. – Могилев: Тип. губ. правл., 1861. – 18, 34, 106, 115, 144, 52, 8 с.
13. Памятная книжка Могилевской губернии на 1890 год. – Могилев: Тип. губ. правл., 1890. – 464 с.
14. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитетом М-ва вн. дел; Под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб.: Тип. Спб. акц. общ. «Слово». – [Вып.] 23: Могилевская губерния. – 1903. – [4], XVI, 276 с.
15. Памятная книжка Могилевской губернии на 1916 год. – Могилев: Губ. тип., 1916. – XVI, 256, X, 69, 72 с.
16. Аникиевич, К.Т. Сенненский уезд Могилевской губернии / К.Т. Аникиевич. – Могилев: Могил. губ. стат. ком., 1907. – 148 с.

УДК 271-055.2

# РЫМСКА-КАТАЛІЦКІЯ ЖАНОЧЫЯ МАНАСКІЯ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

**Аўсейчык Юлія Аляксандраўна,**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Наваполацк, Беларусь)

*У артыкуле разгледжана гістарыяграфія гісторыі рымска-каталіцкіх жаночых манаскіх супольнасцей. Прааналізавана як айчынныя, так і замежныя (польскія) даследаванні.*

Асаблівасцю рымска-каталіцкай царквы з’яўляецца вялікая колькасць разнастайных мужскіх і жаночых ордэнаў, кангрэгацый і супольнасцей. Перыяд 1920–30-х гг., калі значная тэрыторыя Беларусі з’яўлялася часткай Польшчы, быў даволі спрыяльны для стварэння і рэлакацыі жаночых манаскіх рымска-каталіцкіх супольнасцей.

Нягледзячы на значную ролю жаночых манаскіх супольнасцей у місіянерскай і адукацыйнай дзейнасці на беларускіх землях, у навуковых працах, што выйшлі ў Беларусі, амаль не сустракаецца ніякіх звестак пра іх. Адзіным энцыклапедычным даведнікам па дадзенай праблематыцы з’яўляецца “Рэлігія і царква на Беларусі” [4], які ўтрымлівае невялікія звесткі пра жаночыя каталіцкія манаскія супольнасі. Што датычыцца прац манаграфічнага характару, то яны носяць абагульняючы характар і матэрыялаў па дадзенай тэме амаль не ўтрымліваюць. Варта адзначыць, што найбольш увагі праблемам дзейнасці жаночым манаскім супольнасцям ўдзяляе Э.С. Ярмусік [5].

На тэрыторыі Беларусі былі заснаваны дзве супольнасці: сясцёр эўхарыстак і сясцёр місіянерак. Менавіта таму гэтыя дзве супольнасці з’яўляюцца найбольш цікавымі для нашага вывучэння.

Першым аўтарам, якія пакінуў звесткі пра сясцёр місіянерак, была сама заснавальніца супольнасці Баляслава Лямэнт. Яна стварыла канстытуцыю супольнасці, напісала шмат малітваў, сцэнарыяў для калядных пастановак, пакінула багатую карэспандэнцыю. Самай вядомай і фундаментальнай працай, якая асвятляе дзейнасць Супольнасці Сясцёр Місіянерак з’яўляецца яе кніга “Каб любіць цябе ўсё мацней” (“Bym cię kochała coraz gorecej”) [11].

У розныя часы гісторыя дзейнасці Сясцёр Місіянерак закранаıася польскімі даследчыкамі Іахімам Раманам Барам[7;8], Адрыянай Гранкевіч [10], Даротай Душык [9], Ядзвігай Стабінскай [14], і інш.

Адным з найбольш вядомых польскіх даследчыкаў па гісторыі супольнасці з’яўляецца паляк, айцец-капуцын Іахім Раман Бар. Даследаванню супольнасці аўтар прысвяціў працу “Супольнасць Сясцёр Місіянерак Святой Сям’і” (“Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny”) [8]. Пад яго рэдакцыяй таксама выйшаў зборнік “Выбраныя лісты Баляславы Лямэнт. Супольнасць Сясцёр Місіянерак Святой Сям’і” (“Wybor pism Bolesławy Lament. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny”) [7]. Акрамя саміх лістоў, даследчык у гэтым выданні змяшчае і кароткую гісторыю супольнасці.

Развіццё і ўтварэнне Супольнасці Сясцёр Місіянерак даследавала таксама Адрыяна Гранкевіч. Вынікам яе даследаванняў сталі працы, сярод якіх – “Жыццё і дзейнасць Баляславы Лямэнт (1862–1946), “Заснавальніцы Супольнасці Сясцёр Місіянерак св. Сям’і” (“Życie i działalność Bolesławy Marii Lament (1862–1946). Założycielki Zgromadzenie Siostr Misjanarek sw. Rodziny”) [10].

Жыццё і дзейнасць заснавальніцы супольнасці Баляславы Лямэнт адлюстраваны ў працы Д. Душык “Дарога да паяднання” (“Droga ku jedności”) [9]. Біяграфіі заснавальніцы супольнасці місіянерак прысвечана таксама праца Я. Стабінскай “Шукаць і збаўляць” (“Scukać i zbawiać. Posłannictwo Bolesławy Lament”) [14].

Першым, хто займаўся вывучэннем супольнасці эўхарыстак, быў іх заснавальнік віленскі біскуп Юрый Матулевіч. Ён стварыў канстытуцыю супольнасці, пакінуў шмат пісьмовай спадчыны: навуковыя працы з галіны тэалогіі і сацыялогіі, апрацаваныя для некалькіх законніцкіх супольнасцей статуты, пастырскія лісты, біскупскія прамовы і распараджэнні, рэкалекцыйныя парады для святароў і законнікаў, багатую карэспандэнцыю. Самай вядомай і фундаментальнай яго працай з’яўляецца “Духовы дзённік” [2;12].

У розныя часы гэтую праблему закраналі Аляксандр Жарнасек [16], Аляксандр Надсан [3].

Адной з найбуйнейшых польскіх даследчыц па гісторыі супольнасці з’яўляецца Галіна Стшэлецка “Пачаткі Супольнасці Сясцёр Служэбніц Езуса ў Эўхарыстыі (1923–1945)” (“Początki Zgromadzenia Siostr Sluzebnic Jezusa w Eucharystii (1923–1945)” [15]). Развіццё і ўтварэнне Супольнасці Сясцёр Эўхарыстак даследавала Марыя Багуміла Пецына. Вынікам яе даследаванняў стала праца “Асоба і справы блаславёнага Юрыя Матулевіча” (“Osobowośc i działanie blogoslawionego Jerzego Matulewicza” [13]).

У марыянскіх законніцкіх дамах у Англіі, Чэхіі, Казахстане, Германіі, Польшчы і Беларусі праводзяцца міжнародныя сімпозіумы. На гэтых мерапрыемствах прадстаўляюць таксама працы па гісторыі супольнасці. На аснове іх былі вы-

дадзены працы, ў якіх асвятлялася дзейнасць Сясцёр Эўхарыстак. Адной з такіх прац з'яўляецца кніга "Хрыстос-Марыяне-Беларусь" [1].

Такім чынам, трэба адзначыць, што самастойных навуковых даследаванняў у беларускай гістарыяграфіі прысвечаных вывучэнню рымска-каталіцкіх жаночых манаскіх супольнасцей не існуе. Праблематыка дзейнасці супольнасцей доўгі час разглядалася толькі ў польскай гістарыяграфіі. У даследаваннях айчынных навукоўцаў узгадваюцца толькі асобныя звесткі пра жаночыя супольнасці.

## Літаратура

1. Марыяне на Беларусі // Хрыстос–марыяне–Беларусь; Рэд. К. Пэка. – Мінск: Про Хрысто, 2005. – С. 7–26.
2. Матулевіч, Ю. Духовы дзённік / Ю. Матулевіч . – Рым–Друя: Wydawnictwo Ksieży Mariani, 1997. – 98 с.
3. Надсан, А. Pro patria aliena / А. Надсан. – Мінск: Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд», 2006. – 159 с.
4. Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. /Рэдкал.:Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.
5. Ярмусік, Э. Рымска-каталіцкія манастыры ў сацыяльным і духоўным жыцці Беларусі (30-я гг. ХХ ст. – пачатак ХХІ ст.) / Э. Ярмусік // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. – 2009. – №2(37). – С. 5–13.
6. Babinska, J. Swięci słuchaja naszych prosb / J. Babinska. – Warszawa: Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny, 2000. – 95 s.
7. Bar, J. Wybor pism Bolesławy Lament. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny / J. Bar. – Białystok, 1975. – 185 s.
8. Bar, J. Zgromadzenie Siostr Misjanarek Swiętej Rodziny / J. Bar. – Rzym, 1975. – 117 s.
9. Duszyk, D. Droga ku jedności / D. Duszyk. – Warszawa, 1986. – 31 s.
10. Gronkiewicz, A. Życie i działalność Bolesławy Marii Lament (1862–1946). Założycielki Zgromadzenie Siostr Misjanarek sw. Rodziny / A. Gronkiewicz . – Warszawa, 1990. – 354 s.
11. Lament, B. Bym cie kochała coraz gorecej / B. Lament. – Warszawa, 1997. – 143 s.
12. Matułewicz, J. Dzienniki / J. Matułewicz. – Licheń Stary: Centrum Formacji Maryjnej «Salvatoris Mater», 2009. – 310 s.
13. Pecyna, M. Osobowosc I dzialanie blogoslawionego Jerzego Matulewicza / M. Pecyna. – Wroclaw, 1990. – 213 s.
14. Stabińska, J. Szukać i zbawiać. Posłannictwo Bolesławy Lament / J. Stabińska. – Warszawa: Wydawnictwo Archidiecezji Warszawskiej, 1991. – 175 s.
15. Strzelecka, H. Początki Zgromadzenia Siostr Służebnic Jezusa w Eucharystii (1923–1945) / H. Strzelecka. – Warszawa: Akademia Teologii Katolickiej, 1987. – 302 s.
16. Zharnasek A. Dzieje marianów w Drui w latach 1923–1938 / Zharnasek A.; Praca magisterska pisana na seminarium znhistorii Koscioła pod kierunkiem ks. prof. dr hab. Marka Zahajkiewicza. – Lublin: Katolicki Uniwersytet Lubelski, 2005. – 123 s.

УДК 2

# ХРИСТИАНЕ ВЕРЫ ЕВАНГЕЛЬСКОЙ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ: ИНСТИТУЦИАЛИЗАЦИЯ И ДИНАМИКА РАЗВИТИЯ

**Бричковский Александр Михайлович,**
Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова
(г. Могилев, Беларусь)

*В статье произведен анализ изменения количества общин Христиан веры евангельской в современной Беларуси, рассмотрен процесс институци-ализации ХВЕ в Республике Беларусь.*